"Что нового я узнал о себе?"; "Что нового я узнал других?"; "Кто мне помогает в работе над собой?" и др.

Компановка тренинговых занятий может быть самой различной, в зависимости от цели, которую ставит преподаватель. Здесь имеют значение творческие способности, эрудиция, отношение между преподавателем и студентами, а также общая атмосфера доброжелательности, положительного эмоционального фона и комфортности каждого в группе.

*Литература*

1. Коломинская О.Я. Тренинг личностного роста. Психология, 1996.

2. Кривцова С.В., Мухаматулина Е.А. Тренинг. Навыки конструктивного взаимодействия с подростками. М., Генезис, 1999.

3. Прутченков А.С. Школа жизни: методические разработки социальнопсихологических тренингов. М.: МООДиМ "Новая цивилизация", Педагогическое общество России, 2000.

4. Прутченков А.С. Социально-психологический тренинг межличностного общения. М.: "Знание", 1991.

**В.І.Свірыдзенка (*Мінск*)**

## ПРАЦА ПА ІНТАНАЦЫІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ СІНТАКСІСУ Ў ПАЧАТКОВЫХ КААСАХ

Асновай звязнага маўлення школьнікаў з'яўляецца ўменне будаваць сказы розных тыпаў і свабодна карыстацца імі ў моўнай практыцы. Афармляючы свае думкі ў сказ, вучань авалодвае граматычным ладам мовы. Разуменне пэўных формаў немагчыма ў адрыве ад названай сінтаксічнай адзінкі. Сказ – гэта аснова для правядзення ўсёй граматыка-арфаграфічнай і слоўнікавай работы, "гэта той фон, на матэрыяле якога дзеці вучацца нормам вымаўлення, нормам словазмянення і словаспалучальнасці, фарміруюць граматычныя ўменні, арфаграфічныя і моўныя навыкі" [6, с. 203].

Сказ – двухбаковы моўны знак, абодва бакі якога – фармальны і сэнсавы – знаходзяцца ў дыялектычным адзінстве і складаным узаемадзеянні.

На сэнсавы бок сказа вялікі ўплыў аказвае інтанацыя. На думку М.Р.Львова, "добрае, выразнае чытанне сказа дае вельмі многа для развіцця маўлення. Гэта ж можна сказаць і пра гучанне сказаў ва

уласным маўленні настаўніка, якое для навучэнцаў заўсёды ўзор" [4, с. 65].

Сінтаксічныя функцыі інтанацыі, яе ўзаемадзеянне з граматычнай будовай, лексічнымі і стылістычнымі асаблівасцямі беларускага сказа даследуюцца ў шэрагу прац Л.І.Бурака. Навуковаму апісанню рытміка-меладычнай сістэмы беларускай мовы прысвечаны кнігі Л.Ц.Выгоннай. Каштоўныя заўвагі па інтанацыі розных сінтаксічных адзінак можна знайсці ў А.Я.Міхневіч і іншых беларускіх даследчыкаў.

Як адзначае Л.Ц.Выгонная, "інтанацыя складаецца з цэлага рада ўзаемазвязаных кампанентаў, і ў гэтым сэнсе інтанацыя – комплекс разнастайных фанетычных сродкаў" [2, с. 54]. Яна існуе ў мове як спецыфічны сродак для фарміравання выказвання і раскрыцця зместу. Моўнае значэнне інтанацыі відавочна таксама таму, што "носьбіты мовы з пэўнай мелодыкай звязваюць пэўны сэнс, прыняты ў данай мове" [2, с. 33].

Інтанацыя разам з гукавым складам выказвання з'яўляецца тым сродкам, які абумоўлівае канкрэтнае выражэнне лексічнага і граматычнага зместу. Пэўныя сінтаксічныя значэнні яна здольна перадаваць шляхам узаемадзеяння з іншымі сродкамі выражэння граматычных значэнняў. "Сэнсавыя магчымасці дадзенай граматычнай канструкцыі сказа невымерна ўзрастаюць, калі выкарыстаць пры яе гукавой рэалізацыі ўсю разнастайнасць інтанацыйна-сінтаксічных рэсурсаў ... мовы" [1, с. 415].

Пры навучанні выразнаму чытанню ў сувязі з курсам сінтаксісу і пунктуацыі перад настаўнікам стаяць наступныя задачы ([3; 5]):

1. Развіць маўленчы слых вучняў, гэта значыць навучыць слухаць і чуць вуснае маўленне.

2. Навучыць выразна "чытаць" знакі прыпынку.

3. Навучыць чытаць і гаварыць ярка, выразна.

Даследчыкі дзіцячага маўлення, як педагогі, так і псіхолагі, адзначаюць, што звычайна ў пачатковых класах звяртаецца мала ўвагі на інтанацыйны слых, на ўменне чуць інтанацыю канца сказа і пералічальную; у той жа час даказана, што з развіццём інтанацыйнага слыху павышаецца агульная моўная культура вуснага маўлення, яно становіцца больш дакладным і выразным. Маўленчы слых трэба развіваць на працягу ўсяго перыяду школьнага навучання. Рэгуляваць яго фарміраванне можна не толькі сродкамі выразнага чытання кніжных тэкстаў. Слыхавы і рухальны аналізатары працуюць актыўна і пры

стварэнні ўласнага тэксту. Гэтаму трэба ўдзяляць вялікую ўвагу, з тым каб у вучняў замацаваўся інтанацыйны стэрэатып розных абаротаў сказа.

Неабходна вучыць дзяцей інтанацыйна выдзяляць названую сінтаксічную адзінку з маўленчай плыні. Малодшыя школьнікі знаёмяцца з апавядальным сказам, у якім "абазначана паступовае павышэнне голасу да сярэдзіны сказа, паўза (часцей паміж саставам дзейніка і саставам выказніка) і паніжэнне голасу да канца сказа" [3, с. 11].

Пры вывучэні пабуджальных сказаў вучні практычна знаёмяцца з лагічным націскам. На думку В.Н.Галімавай, гэты тэрмін ужо "можна паведаміць навучэнцам, ён не перашкодзіць ім і ў той жа час палегчыць працу настаўніка" [3, с. 13]. Дарэчы будзе адразу растлумачыць дзецям розніцу паміж тактавым і лагічным націскам: апошні – гэта выдзяленне інтанацыяй самых важных па сэнсу слоў, а не проста павышэнне голасу перад паўзай.

Пры знаёмстве з пытальнымі сказамі трэба звярнуць увагу дзяцей на тое, што "ў пытальных словах і сканцэнтравана пытанне. На іх голас павышаецца, а потым адразу паніжаецца, і інтанацыя канца пытальных няклічных сказаў супадае з інтанацыяй канца апавядальных сказаў" [3, с. 15]. У спакойным, неўсхваляваным маўленні нават пытальнае слова не выдзяляецца рэзка, бо і без інтанацыі, па наяўнасці яго зразумела, што фраза утрымлівае пытанне. Таму можна навучыць дзяцей чытаць сказы ў дзвюх сітуацыях: спакойнай і ўсхваляванай.

Знаёмства з клічнымі сказамі можна пачаць з назірання над узорным чытаннем настаўніка, які вымаўляе адну і тую ж фразу з рознымі пачуццямі, а дзеці павінны вызначыць, якое пачуццё выражана, і расказаць, у якіх умовах гэта можа адбывацца. Па-за звязным тэкстам або па-за пэўнай сітуацыяй выразнае чытанне клічных сказаў не атрымліваецца. Таму настаўнік спачатку расказвае пра абставіны, у якіх можа аказацца вучань, а потым прапаноўвае зрэагаваць на іх. Далей вучні самі прыдумваюць розныя сітуацыі і заканчваюць тым жа - правільным чытаннем гэтых сінтаксічных адзінак.

Неразвітыя і развітыя сказы школьнікі чытаюць з паўзай паміж групай дзейніка і выказніка. Гэта вельмі карысна, бо яшчэ раз "вучыць дзяленню сказаў на такты, але тут трэба сказаць пра адсутнасць коскі на месцы паўзы..." [3, с. 18].

Настаўніку неабходна вучыць дзяцей вымаўляць сказы з аднароднымі членамі з інтанацыяй пералічэння. На думку В.Н.Галімавай,

галоўнае тут – "не лагічны націск, а аднатоннасць, аднатыпнасць вымаўлення. Дасягаецца яна ў першую чаргу паўзамі: кожны аднародны член вымаўляецца як бы асобна, чаго не бывае з іншымі словамі ў няклічным сказе. Паўзы паміж аднароднымі членамі аднолькавай працягласці. Да таго ж аднародныя члены вымаўляюцца адным тонам, на адной вышыні, г. зн. рытмічна" [3, с. 19]. Яны выдзяляюцца ў нейкай меры і націскам. Але апошні хутчэй тактавы, чым лагічны: слова тут як бы складае цэлы такт. У клічных сказах аднародныя члены вымаўляюцца з лагічным націскам і з нарастаннем вышыні і сілы голасу на кожным з іх.

Пры навучанні дзяцей пералічальнай інтанацыі лягчэй за ўсё звярнуць іх увагу на паўзы паміж аднароднымі членамі пры бяззлучнікавым іх спалучэнні (напрыклад, Ластаўкі, гракі, жаваранкі, салаўі восенню адлятаюць у вырай). Пры гэтым можна супаставіць і параўнаць першую частку сказа з другой, дзе паўзы можна не рабіць. Астатнія элементы пералічальнай інтанацыі дзеці ўспрымуць на слых і адновяць іх шляхам пераймання ў настаўніка. У ходзе аналізу трэба заўважыць, што паўза ёсць і пасля апошняга аднароднага члена, але яна не супадае з коскай. Гэты знак прыпынку тут не можа быць пастаўлены па дзвюх прычынах: паміж дзейнікам і выказнікам коска не ставіцца; рад аднародных членаў скончыўся, раздзяляць больш няма чаго.

Трэба звярнуць увагу дзяцей на тое, што сказы з аднароднымі членамі, злучанымі супраціўнымі злучнікамі *а*, *але*, чытаюцца не з пералічальнай, а з супастаўляльнай інтанацыяй. На словы, якія абазначаюць паняцці, што супастаўляюцца, падаюць лагічныя націскі. Але лепш было б сказаць крыху інакш: неабходна, звярнуўшы ўвагу, навучыць малодшых школьнікаў практычна гэтай інтанацыі.

Пасля выканання заданняў з асобнымі сказамі пажадана перайсці да звязнага тэксту.

Як адзначае М.Р.Львоў, "для эфектыўнай працы са сказам дзеці павінны таксама ўмець рабіць лагічныя націскі, сэнсавыя і псіхалагічныя паўзы, умець эмацыянальна афарбоўваць сваё маўленне, вымаўляць сказы ў запаволеным або паскораным тэмпе, грамчэй або цішэй. Важна развіваць дыханне, каб школьніку не трэба было рабіць лішнюю паўзу для ўдыху ў працэсе чытання або вымаўлення сказа" [4, с. 66].

“Адсутнасць увагі да інтанацыі пры вывучэнні сінтаксісу ў школе, – заўважае Р.П.Фірсаў, – вядзе да няпоўных ведаў вучняў па гэтым раздзеле граматыкі, да механічнага завучвання і, значыць, да недастатковага разумення шэрагу сінтаксічных правілаў і азначэнняў...” [5, с. 76].

Праца над інтанацыйна-сэнсавым чляненнем сказа спрыяе лепшаму засваенню сінтаксічнай тэорыі інтанацыі, развіццю навыкаў выразнага чытання і павышае цікавасць вучняў да вывучэння беларускай мовы.

*Літаратура*

1. Виноградов В.В. Основные вопросы синтаксиса предложения (на материале русского языка) // Вопросы грамматического строя. – М.: Изд-во АН СССР, 1955. – 482 с.

2. Выгонная Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 215 с.

3. Галимова В.Н. Работа над интонацией прп изучении синтаксиса и пунктуации в 4 классе // Некоторые вопросы учебно-воспитательной работы в школе. – Архангельск: Сев.-Зап. кн. изд-во, 1972. – С. 3–23.

4. Львов М.Р. Методика развития речи младщих школьников: Пособие для учителя. – 2-е изд., перераб. – М.: Просвещение, 1985. – 176 с.

5. Фирсов Г.П. Значение работы над интонацией для усвоения синтаксиса и пунктуации в школе / Под ред. акад. В.В.Виноградова. – М.: Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1962. – 447 с.

6. Фомичева Г. А. Предложение // Методика грамматики и орфографии в начальных классах / Под ред. Н.С.Рождественского. – М.: Просвещение, 1975. – С. 202–203.

**Л.В.Сергеенко (*Витебск*)**

## РОЛЬ ПЕДАГОГА В ПРИОБЩЕИИИ УЧАЩИХСЯ К ИЗОБРАЗИТЕЛЬИОМУ ТВОРЧЕСТВУ

Само по себе творчество как таковое находит применение в самых разнообразных видах деятельности человека, но опыт творческой деятельности наиболее доступен подрастающему поколению именно в практической изобразительной деятельности, которая посильна детям самого младшего возраста. Организованный характер таких занятий (уроки